ГАЗЕТА ЗАСНАВАНА Ў КАСТРЫЧНІКУ 1939 ГОДА.

# ГРОДЗЕНСКАЯ праўда

№70 (16730)

серада, 4 верасня 2019 года

80 коп.

ОБЩЕПОЛИТИЧЕСКАЯ ГАЗЕТА

# “Вялікая місія Дня пісьменства – аб’ядноўваць усіх беларусаў свету”

## Свята кнігі і беларускага слова прайшло ў Слоніме

XXVI **Дзень беларускага пісьменства вітаў старажытны і прыгожы Слонім. Сустрэцца з сучаснымі пісьменнікамі і далучыцца да вялікага свята ў горад над Шчарай прыехалі больш за 50 000 гасцей з усёй краіны і нават з-за мяжы.**









Працяг тэмы на стар. 4-7

ОКНА
БАЛКОННЫЕ РАМЫ
СКИДКА
–50%
Собственная рассрочка
80152 31 90 90
8033 31 90 900

XXVI ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА Ў СЛОНІМЕ

# “Вялікая місія Дня пісьменства – аб’ядноўваць усіх беларусаў свету”

► З 1-й стар.

## СЛОНІМ ВІТАЎ ГАСЦЕЙ

Урачыстае адкрыццё Дня беларускага пісьменства пачалося з прыгожага шэсця, якое ўзначалілі харугвы з назвамі папярэдніх сталіц свята. Сярод іх – і гарады Гродзеншчыны: Мір, Навагрудак, Смаргонь і Шчучын. І, канешне, Слонім, які меў гонар прымаць вялікае рэспубліканскае свята беларускага слова і кнігі сёлета.



Віталі шэсце ля галоўнай сцэнічнай пляцоўкі каля Цэнтра культуры і адпачынку. У імправізаванай зале пад адкрытым небам – ганаровыя госці свята: прадстаўнікі кіраўніцтва краіны, дыпмісій, пісьменнікі з Беларусі і замежжа, ганаровыя грамадзяне Слоніма, а таксама шматлікія жыхары і госці слонімскай зямлі.

Прывітальны адрас Кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі гасцям і ўдзельнікам свята зачытаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Андрэй Кунцэвіч.

Гасцей таксама віталі гаспадары свята – старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў і Слонімскага райвыканкама Генадзь Хоміч. Яны падкрэслілі: Слонім сваёй гісторыяй заслужыў права быць сталіцай Дня беларускага пісьменства.

*– Слонімская зямля – край моцных культурных традыцый, якія сваімі каранямі ідуць далёка ў мінуўшчыну. Са Слонімам звязана імя выбітнага палітычнага дзеяча Льва Сапегі. Статут Вялікага княства Літоўскага, да распрацоўкі якога ён прыклаў руку, лёг у аснову канстытуцый многіх дзяржаў. Мы ганарымся, што напісаны ён быў па-беларуску,* – адзначыў Уладзімір Краўцоў. – *Прынёманскі край зрабіў вялікі ўнёсак у справу кнігавыдання. Рукапісныя кнігі – Лаўрышаўскае і Жухавіцкае Евангеллі – былі створаны на гэтай зямлі яшчэ ў XIV стагоддзі. Спрыялі развіццю адукацыі друкарні, якія з пачатку XVIII стагоддзя дзейнічалі ў Слоніме, Любчы, Гродне, Мураванай Ашмянцы і іншых месцах. Вялікія кнігазборы мелі беларускія магнаты – Радзівілы, Тышкевічы, Храптовічы, палацы і маёнткі якіх стаялі ў Прынямонні.*

Лёс многіх вядомых пісьменнікаў звязаны з Гродзеншчынай. Да прыкладу, тут нарадзіўся адзін з заснавальнікаў беларускай літаратуры Францішак Багушэвіч. Жыла Алаіза Пашкевіч, якая адна з першых пачала выдаваць падручнікі на беларускай мове.

Багата наша зямля талентамі і сёння. На Гродзеншчыне выходзіць у свет больш за паўсотні газет і часопісаў, сотні мастацкіх і навуковых кніг, вучэбных дапаможнікаў выдаюць штогод мясцовыя друкарні. Сёлетні юбілей вобласці – яе 75-годдзе – таксама адзначаны выхадам шэрагу кніг, якія адлюстроўваюць яе гісторыю і сучаснасць.

## ЗЯМЛЯ І ЯЕ СЫНЫ

Пра выбітных асоб слонімскай зямлі і Гродзеншчыны распавяла гасцям тэатралізаваная дзея “Зямля пад белымі крыламі”. Розныя эпохі і розных асоб аб’ядналі разважанні юнака і дзяўчынкі, якія шукалі адказ на пытанне, ці можна стаць сусветна вядомым, калі ты нарадзіўся і жывеш у невялікім мястэчку. А знайшлі яго ў самых розных эпохах слонімскай гісторыі.

У адну прыгожую і падрыхтаваную з вялікім густам дзею аб’ядналіся самыя розныя эпохі і эпізоды гісторыі Слонімшчыны і Прынямоння. Былі тут згадкі пра з’яўленне абраза Маці Божай Жыровіцкай, легенда пра візіт у гэтыя мясціны вялікага князя Вітаўта. Адным з цэнтральных эпізодаў стала гісторыя пра выданне Статута ВКЛ. Яшчэ адна старонка слонімскай гісторыі звязана з імем Міхаіла Казіміра Агінскага. Прынамсі, менавіта ён пабудаваў у горадзе тэатр, трупа якога была вядома далёка за мяжой. Гучаў на адкрыцці і вядомы паланэз “Развітанне з радзімай” – як згадка пра пляменніка Міхаіла Казіміра Агінскага – кампазітара Міхаіла Клеафаса Агінскага.

Далей – новы эпізод, літаратурны, паводле “Сотнікава” Васіля Быкава. Ён нагадвае пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны, што адбываліся на Слонімшчыне. І, нарэшце, наш сучаснік, пісьменнік Алег Лойка, са шчырымі словамі-прызнаннямі ў любові роднай Слонімшчыне: “Я вырас, захапляючыся тут высокім небам, Шчары ціхім звонам… І сэрцам палюбіў я гэты кут – цябе, мой старадаўні родны Слонім”.

Гучалі беларускія музыка і песні ў выкананні гуртоў “Літы талер”, “Беларусы”, Пятра Ялфімава, Ядвігі Паплаўскай, салісткі абласной філармоніі Аліны Чыжык, групы “Чысты голас”.



## ЛІТАРАТУРНЫЯ ЗДАБЫТКІ

Не абышлося падчас адкрыцця без каштоўных падарункаў. Адзін з іх зрабіў пісьменнік і мецэнат Валерый Казакоў. Ён перадаў Гродзеншчыне рарытэтны асобнік Статута 1588 года, які пабачыў свет у 1916-м.

Пачэснымі ўдзельнікамі ўрачыстай цырымоніі адкрыцця Дня беларускага пісьменства таксама сталі вядомыя творцы – пераможцы Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Іх віншавалі міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр Карлюкевіч, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец і старшыня журы конкурсу Іван Саверчанка. Лепшымі аўтарамі ў гэтым годзе ў розных намінацыях сталі ўраджэнец Слонімшчыны Уладзімір Ягоўдзік, а таксама Алег Ждан, Мікола Маляўка, Віктар Хурсік, Святлана Калядка і Станіслава Умец.

**Намеснік прэм’ер-міністра Беларусі Ігар ПЕТРЫШЭНКА:**

*– Правільна, што Дзень беларускага пісьменства пастаянна мяняе прапіску. Мы бачым, як напярэдадні свята змяніўся горад Слонім: папрыгажэлі вуліцы, абнавілася інфраструктура. І гэта ўсё застанецца тут, на слонімскай зямлі. Наступны горад – Бялынічы. Так усе гарады падцягваюцца да высокага статусу з пункту гледжання камфорту для жыцця людзей. Мы ў кожным куточку краіны павінны стварыць камфортную атмасферу і ў плане быту, і ў плане культуры. Важна, каб людзі ганарыліся сваімі роднымі мясцінамі.*

# Кніжны “Санет”

**Кнігарню з назвай “Санет” урачыста адкрылі ў цэнтры Слоніма па вуліцы Чырвонаармейскай. Гэта дванаццаты аб’ект кнігагандлёвай сеткі “Белкніга” ў вобласці.**



Больш за месяц працавала ў тэставым рэжыме новая кнігарня. І за гэты час яна паспела стаць не проста гандлёвай пляцоўкай, але сапраўдным правадніком у свет літаратуры: кожны тыдзень тут праходзілі прэзентацыі твораў беларускіх аўтараў.




З прывітальным словам да гасцей урачыстасці звярнуўся **міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч:**

*– Сёння ў сістэме адкрытага акцыянернага таварыства “Белкніга” працуюць больш за 100 такіх магазінаў. Мы спадзяемся, што кожны год на Дзень беларускага пісьменства “Белкніга” будзе рабіць падобныя падарункі чытачам. Мы верым у тое, што друкаваная кніга ў суладдзі з сучаснымі тэхналогіямі яшчэ доўга-доўга будзе заставацца з намі, з чытачамі, з нашымі паслядоўнікамі.*

Старшыня Слонімскага райвыканкама Генадзь Хоміч адзначыў, што гэта сапраўды доўгачаканая падзея для горада – доўгі час частка забудовы не выкарыстоўвалася. Сёння на плошчы ў 120 квадратных метраў размясцілася больш за 12 тысяч адзінак кнігадрукаванай і канцылярскай прадукцыі. Таксама вельмі важна, што адкрыты пяць працоўных месцаў у новым магазіне.

# Разляціцца па свеце ўнікальны канверт





**У Слоніме адбылося гашэнне канверта да XXVI Дня беларускага пісьменства.**

Ва ўрачыстай цырымоніі спецыяльнага гашэння канверта прынялі ўдзел намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй Кунцэвіч, намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Ігар Петрышэнка і старшыня аблвыканкама Уладзімір Краўцоў.

Падпісаны ганаровымі гасцямі цырымоніі канверт аформлены ў альбом і будзе перададзены ў музей пошты ў Гродне. Па адным завізаваным экзэмпляры застанецца ў аўтараў подпісаў.

Святочны канверт выпушчаны тыражом 30 тысяч экзэмпляраў. На ім – выявы Спаса-Прэабражэнскага сабора, касцёла Святога Апостала Андрэя, будынка чыгуначнага вакзала, эмблема Дня беларускага пісьменства, герб Слоніма. На зваротным боку канверта можна даведацца не толькі аб падзеях Дня беларускага пісьменства ў Слоніме, але і пра гісторыю свята.

Асаблівую цікавасць для філатэлістаў прадставіць унікальная марка, таму што кожны яе элемент прамаляваны мастаком. У аснове выявы – від на стары Слонім. Марка з'яўляецца арыгінальнай, таму што асобна ад такога канверта не існуе.

Дарэчы, гашэнне канверта стала цэнтральным эпізодам у рабоце паштовага падворка, дзе развярнулася выстаўка канвертаў, паштовак і буклетаў, якія выпускаюцца да Дня беларускага пісьменства з 1994 года.

# Сапега вярнуўся ў Слонім

**Велічная фігура выбітнага дзяржаўнага дзеяча сёння ўзвышаецца ў скверы ў цэнтры Слоніма: Леў Сапега нібы крочыць па горадзе, якім валодаў больш за чатыры стагоддзі таму.**

Менавіта гэты перыяд нярэдка называюць “залатым векам Слоніма”. У руках – булава і разгорнуты світак з фрагментам тэксту прывілея Жыгімонта III, якім ён даў Сапегу права на выданне зводу законаў ВКЛ. Такім убачылі і ўвасобілі ў бронзе асобу вялікага канцлера літоўскага, старасты слонімскага аўтары скульптуры ўраджэнец Слонімшчыны Іван Міско, а таксама яго калегі па творчым цэху Уладзімір Пінін і Сяргей Логвін.

*– Легендарныя постаці вяртаюцца ў сучасную Беларусь – помнікамі, кнігамі, артэфактамі,* – адзначыў **міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч.** *– Гэтыя сімвалы не нарадзіліся б без творчай думкі, натхнення нашых мастакоў, пісьменнікаў, творцаў.*

Неацэнная заслуга Льва Сапегі ў выданні ў 1588 годзе Статута ВКЛ. Акрамя таго, што ён рэдагаваў асобныя тэксты, фінансаваў выданне дакумента, таксама актыўна настойваў на тым, каб Статут быў напісаны на старабеларускай мове.

Што тычыцца яго ролі ў станаўленні Слоніма, варта згадаць, што гэты горад ён атрымаў ва ўпраўленне ў 1586 годзе. Па яго просьбе ў 1591-м Слоніму было пацверджана Магдэбургскае права і дараваны герб. За час праўлення Льва Сапегі Слонім стаў развітым цэнтрам рамёстваў і гандлю. Ды і ўвогуле ўзвысілася палітычная значнасць горада: сюды з'язджаліся для правядзення перадсеймавых генеральных сеймікаў ВКЛ сенатары і паслы паявтовай шляхты.

Таму невыпадкова ўсе слонімчане даўно чакалі адкрыцця помніка.

*– Гэта значная падзея нагадвае пра сувязь мінуўшчыны і сучаснасці. Помнік Льву Сапеге – не проста выдатнае ўпрыгожванне горада. Гэта і нагода задумацца, а што асабіста ты пакінеш у спадчыну пасля сябе,* – упэўнены **старшыня Слонімскага райвыканкама Генадзь Хоміч.**



# Пляцоўка для абмену вопытам

XXVI ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА Ў СЛОНІМЕ

**Літаратуразнаўцы і аўтары з 14 краін сабраліся за круглым сталом у Свята-Успенскім Жыровіцкім манастыры.**

Тэмы, якія ўзнімалі вучоныя-літаратары, пісьменнікі, паэты, перакладчыкі і публіцысты з Беларусі, Украіны, Літвы, Сербіі, Азербайджана, Індыі, Грузіі і іншых краін за круглым сталом “Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго”, тычыліся розных аспектаў умацавання міжнацыянальных сувязей у развіцці і вывучэнні літаратуры. Размова ішла і пра новыя формы культурнага і навуковага супрацоўніцтва, і пра творчыя арыентыры сучасных аўтараў, і пра мастацкі пераклад, які, як вядома, з'яўляецца прамым шляхам да збліжэння культур.

*– Жыровічы сталі месцам правядзення міжнароднай літаратурнай сустрэчы невыпадкова,* – адзначыў **міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч.** *– У наступным годзе гэтыя святыя мясціны чакае вялікі юбілей – 500-годдзе з дня заснавання Свята-Успенскага Жыровіцкага манастыра і 550-годдзе з'яўлення Жыровіцкай іконы Божай Маці. Хацелася, каб госці нашага круглага стала і цудоўнага свята – Дня беларускага пісьменства – мелі магчымасць пазнаёміцца з гісторыяй адной з галоўных святыняў Гродзеншчыны, натхніцца яе веліччу.*



Сярод удзельнікаў круглага стала было многа вядомых людзей, якія зацікаўлены ў пашырэнні міжнародных літаратурных стасункаў з Беларуссю і гатовы пазіцыянаваць беларускую кнігу ў сваіх краінах.

Удзельнікі сустрэчы зышліся ў адзіным меркаванні: міжнародны круглы стол – гэта пляцоўка не толькі для абмену вопытам і прэзентацыі сваіх работ, але і для абмеркавання новых ініцыятыў. Так, плануецца выданне кнігі беларускай паэзіі ў Сербіі, а ў Карэі ўпершыню за апошнія дзесяцігоддзі выйдзе зборнік твораў Янкі Купалы, Якуба Коласа і Максіма Багдановіча.

# Шляхам духоўнасці

**У Слоніме вернікам перадалі благадатны агонь ад Гроба Гасподняга з Ерусаліма.**



Богаслужэнне ў Свята-Троіцкім саборы – свайго роду фінальная кропка маршрута экспедыцыі “Дарога да святыняў”, якая пачалася яшчэ напярэдадні нацыянальнага свята. Навукова-асветніцкая экспедыцыя нарадзілася ў краіне адначасова з Днём беларускага пісьменства, у 1994 годзе. Штогод прымае ўдзел у ёй творчая і навуковая інтэлігенцыя краіны: пісьменнікі, мастакі, музыканты, навукоўцы. Традыцыйна экспедыцыя пачынаецца ў Мінску, у Свята-Духавым кафедральным саборы, дзе захоўваецца благадатны агонь ад Гроба Гасподняга, а далейшы маршрут вызначаецца ў залежнасці ад сталіцы Дня пісьменства.

Больш за 30 удзельнікаў экспедыцыі пачалі свой шлях 28 жніўня і за чатыры дні да старту асноўных святочных мерапрыемстваў Дня пісьменства наведалі галоўныя святыні Мінска і некалькіх раёнаў Мінскай вобласці. На гродзенскай зямлі яны перадалі благадатны агонь вернікам Свята-Елісееўскага Лаўрышаўскага мужчынскага манастыра і храма Святога прарока Іліі на Навагрудчыне, заклалі Сад малітвы каля храма Святых роўнаапостальных Мяфодзія і Кірыла настаўнікаў Славенскіх у горадзе Ваўкавыску.

Увогуле за сваю гісторыю больш чым у чвэрць стагоддзя сотні энтузіястаў працавалі ў складзе экспедыцыі. Больш за 30 тысяч кіламетраў складае агульны маршрут, праведзена мноства навукова-творчых канферэнцый у гарадах і вёсках, асвечаны благадатным агнём сотні пахаванняў абаронцаў Радзімы, пасаджаны Сады супольнай малітвы.

Напоўненае глыбокім сэнсам падарожжа па слонімскай зямлі, дарэчы, пачалося яшчэ напярэдадні. У апошні дзень лета, 31 жніўня, экспедыцыя завітала на асвячэнне капліцы ў гонар святых Пятра і Фяўроніі ў Слоніме, удзельнікі здзейснілі хрэсны ход да Свята-Успенскага сабора ў Жыровічах.

У “Эдэмскім садзе” Свята-Успенскага Жыровіцкага стаўрапігіяльнага мужчынскага манастыра быў закладзены Сад малітвы – вечна зялёная алея з дваццаці шасці дрэў, і гэта лічба невыпадковая – адпавядае парадкаваму нумару цяперашняга свята слова ў Слоніме. У вышытых мяшочках, збанках і капсулах пад карані дрэў тут лягла зямля, урачыста ўручаная экспедыцыі прадстаўнікамі пройдзеных па маршруце раёнаў.

Богаслужэнне ў слонімскім Свята-Троіцкім саборы ўзначаліў архіепіскап Навагрудскі і Слонімскі Гурый, а напрыканцы агульнай малітвы вернікам быў перададзены благадатны агонь. Літаральна за гадзіну да абвяшчэння старту святочных мерапрыемстваў з галоўнай сцэны, пасля набажэнства ў храме ў самым цэнтры Слоніма па горадзе разышліся людзі, якія спяшаліся дадому, зберагаючы агонь свечак і лампад. Усё гэта надало рэспубліканскаму святу яшчэ адну вельмі важную нотку настрою.

► Працяг на стар. 6–7

XXVI
ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА
Ў СЛОНІМЕ

# Яе вялікасць Кніга



**Унікальны “Фестываль кнігі і прэсы” разгарнуўся ў святочным Слоніме.**

Бясспрэчна, галоўнае месца тут было адведзена кнізе – якой яна была калісьці і якой стала ў XXI стагоддзі. У павільёне “Кніга і прэса Рэспублікі Беларусь” былі шырока прадстаўлены лепшыя выданні мастацкай і вучэбнай літаратуры, кнігі для дзяцей і юнацтва, энцыклапедычная літаратура, альбомы, перыядычныя выданні выдавецкага дома “Беларусь сегодня”, РВУ “Выдавецкі дом “Звязда”. Гледзячы на такія кніжныя полкі, разумееш, што папулярнасць папяровай версіі нікуды не знікла ў сучасным свеце.

Лепшыя выданні, пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў, цікавыя па змесце і бездакорныя з пункту гледжання дызайна і паліграфіі – менавіта такія кнігі тут былі ў вялікай калекцыі.

Святочны гандаль разгарнула ААТ “Белкніга”. Тут і класіка беларускай літаратуры, і дапаможнікі для школьнікаў, энцыклапедычныя выданні і ілюстраваныя альбомы.

Немагчыма было прайсці міма рэканструкцыі “Друкарскі двор XVI стагоддзя”, праекта вядомага калекцыянера Уладзіміра Ліхадзедава “У пошуках страчанага”. Фішкай экспазіцыі стала фігура зубра, створаная з дэталяў друкарскіх станкоў мінулага.



*– На ўзноўленым станку Францыска Скарыны можна раздрукаваць першую старонку яго "Бібліі", а таксама прасачыць працэс стварэння паперы,* – адзначыў **лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “За духоўнае адраджэнне” Уладзімір Ліхадзедаў.** *– Свой праект я экспаную на працягу пяці гадоў. Па ім можна прасачыць вытокі сусветнага пісьменства, на свае вочы пабачыць, як вырабляецца папера.*

Выклікала цікавасць у наведвальнікаў свята выстаўка “СМІ Гродзеншчыны”, дзе на працягу двух дзён свае праекты прадстаўлялі выданні прынёманскага краю.

Шумна было і ля павільёна Гродзенскага філіяла “Белсаюздрук”, дзе можна было не толькі набыць друкаваную прадукцыю, але і выпіць кубачак кавы, абмеркаваць кніжную навінку.

# «Код Сапегі» разгадалі больш за 300 чалавек

**Пляцоўка кнігі і прэсы ў цэнтры Слоніма стала стартавай кропкай гістарычнай квэст-гульні “Код Сапегі”.**

На Дні беларускага пісьменства такі праект прадставілі ўпершыню. Больш за 300 чалавек сталі ўдзельнікамі захапляльнага падарожжа па спецыяльна распрацаванай карце, у якую ўвайшлі самыя знакавыя і цікавыя месцы горада. Тлумачыцца гэта проста: у аснову гульні ляглі самыя цікавыя і дакладна вывераныя гістарычныя факты, памножаныя на крэатыўны падыход распрацоўшчыкаў.

Але галоўнае, за што ацанілі квэст яго ўдзельнікі, – магчымасць даведацца штосьці новае пра, здавалася б, такі родны і знаёмы горад.

*– Я нарадзіўся і вырас у Слоніме,* – падзяліўся ўражаннямі **адзін з удзельнікаў квэста Аляксандр Мысліцкі.** *– Але, як высветлілася, многага не ведаў пра яго. Гульня, на першы погляд, вельмі простая – праходжанне ўсіх заданняў заняло не больш за паўгадзіны, але было сапраўды займальна. І, канешне, прыемна, што ўдалося ўсё ж разгадаць "Код Сапегі".*



Такога наплыву гульцоў не чакалі нават арганізатары – карты разышліся практычна за некалькі гадзін. Разгадаць “Код Сапегі” і атрымаць у падарунак настольную гульню "Таямніцы старадаўняга скрыпторыя" хацелі і дзеці, і дарослыя. Многія потым прызналіся, што паўдзельнічалі б у квэсце зноў, нават калі б за яго паспяховае праходжанне не было ніякай узнагароды.

# За цікавы артыкул

**У Слоніме ўзнагародзілі пераможцаў конкурсу СМІ на лепшае асвятленне свята.**

Напярэдадні Дня беларускага пісьменства сярод рэспубліканскіх і рэгіянальных друкаваных СМІ прайшоў конкурс на лепшае асвятленне тэматыкі рэспубліканскага свята. У дзень яго правядзення былі абвешчаны вынікі і названы імёны пераможцаў. Так, сярод рэспубліканскіх СМІ лепшымі сталі карэспандэнт рэдакцыі газеты «СБ. Беларусь сегодня» Таццяна Кандрацьева і пазаштатны карэспандэнт літаратурнага штотыднёвіка «ЛіМ» Сяргей Чыгрын.

Лепшымі ў асвятленні падзей і падрыхтоўкі да цяперашняга Дня пісьменства сярод рэгіянальных СМІ сталі рэдактар аддзела культуры і навукі рэдакцыі газеты «Гродзенская праўда» Таццяна Кузнячэнкава і намесніца галоўнага рэдактара газеты «Ашмянскі веснік» Аліна Санюк.

Падчас уручэння ўзнагароды намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі аблвыканкама Сяргей Шумейка адзначыў, што ў асвятленні гэтай тэмы актыўна працавалі творчыя калектывы газет. Сярод узнагароджаных – рэдакцыі газет «СБ. Беларусь сегодня» і «ЛіМ», абласная газета «Гродзенская праўда» і «Светлы шлях» Смаргонскага раёна.

Была ў цяперашнім узнагароджанні і асаблівая, кулінарная, частка, таксама, дарэчы, звязаная з літаратурай. Упершыню ў рамках Дня беларускага пісьменства ў Слоніме прайшоў незвычайны гастрафэст. Усе прыгатаваныя для яго стравы адпавядалі сваім літаратурным аналагам – тым, што згадваюцца ў творах класікаў. Прадставілі тут такія стравы, як «Шляхецкі карп», «Знатны шчупак», «Фігатэлі» – каўбаскі ў выглядзе падковы і многае іншае.

Да пытанняў кулінарыі гандлёвыя арганізацыі вобласці падышлі вельмі творча, таму вызначаць пераможцаў смаку тут не сталі. Ва ўрачыстай абстаноўцы начальнік упраўлення гандлю і паслуг Вольга Кароткая, намеснік Слонімскага райвыканкама Уладзіслаў Гершгорын і старшыня раённай арганізацыі ГА «Белая Русь» Алег Міско ўручылі дванаццаці прадстаўнікам гандлёвых арганізацый вобласці падзяку старшыні абласнога савета РГА «Белая Русь» і памятныя падарункі.

# Лепшыя чытальнікі краіны

**Сапраўдным святам мастацтва слова стаў фінал рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў “Жывая класіка”.**



Да гэтай падзеі ўдзельнікі ішлі цэлы год. Вясной ва ўсіх абласных цэнтрах прайшлі адборачныя этапы конкурсу, у якіх прынялі ўдзел больш за 13 тысяч школьнікаў. А ў ліпені ў Нацыянальнай бібліятэцы адбыўся паўфінал конкурсу. І вось у Слоніме прайшоў заключны этап, у якім прынялі ўдзел 15 фіналістаў у чатырох узроставых катэгорыях. Ацэньвала выступленні юных чытальнікаў аўтарытэтнае журы, узначальваў якое міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр Карлюкевіч.

А вось і імёны пераможцаў конкурсу: Паліна Пінчук (гімназія г. Петрыкава), Марыя Наско (Тумілавіцкі дзіцячы сад – СШ), Віялета Будзько (СШ №2 г. Докшыцы), Мікіта Шпілеўскі (гімназія №71 г. Гомеля).

# «Уладары сяла» са Шчучыншчыны

**«Уладарамі сяла» сталі Віктар і Наталля Янковічы з гарадскога пасёлка Астрына Шчучынскага раёна.**

На конкурс сям'я прыехала, маючы за плячыма дзевяць гадоў сямейнага стажу. Віктар працуе тэхнікам-асемінатарам. Гаспадыня – жывёлавод. У шчаслівай пары ў групе падтрымкі – два сыны Максім і Мікіта. Менавіта яны, прызнаюцца Янковічы, і дапамаглі здабыць перамогу. Але гэта не ўвесь сакрэт. Кожны конкурс – па сутнасці тое, з чым даводзіцца сутракацца ў паўсядзённым жыцці: распілаваць бервяно, скласці дровы, запрэгчы каня.

Галоўнае на ўсіх этапах – згуртаванасць сям'і. У гэтым і мэта «Уладара сяла» – паказаць сельскі побыт і ўсе яго няпростыя грані. Як кажуць у народзе, “сям'я моцная ладам!” І нішто так не яднае, як агульная справа. З гэтым згаджаецца і сям'я



Нячай. Менавіта канкурсанты з Навагрудскага раёна ў гэты раз занялі трэцяе месца ў конкурсе. На другой прыступцы п'едэстала – сям'я Сідорык са Слонімшчыны.



# Выдатная пляцоўка – крок да спартыўных перамог

**У Слоніме адкрылі шматфункцыянальную спартыўную пляцоўку.**

На базе СДЮШАР №2 адбылося ўрачыстае адкрыццё шматфункцыянальнай спартыўнай пляцоўкі. Першым пратэсціраваў яе міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук. Яна прызначана для гульнёвых відаў спорту – гандбола, валейбола, баскетбола, міні-футбола. Акрамя таго, устаноўлены комплекс вулічных трэнажораў на 22 станкі.

На адкрыцці прысутнічалі начальнік упраўлення спорту і турызму аблвыканкама Алег Андрэйчык, наш зямляк – беларускі атлет, кідальнік молата, трохкратны чэмпіён свету, сярэбраны прызёр летніх Алімпійскіх гульняў у Рыа-дэ-Жанэйра, заслужаны майстар спорту Беларусі Іван Ціхан, знакамітыя выхаванцы СДЮШАР №2 Аліна Світа, Вераніка Леанюк, Максім Крысько.

Як было адзначана падчас адкрыцця аб'екта, на абноўленай спартыўнай базе школы змогуць трэніравацца да 250 выхаванцаў адначасова.

Таксама ў Слоніме прайшлі адкрыты турнір па шашках і шахматах, спаборніцтвы па міні-футболе, турніры па гандболе і валейболе, турнір па весламанні, спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы.



# Ад Слоніма да Быхава




**Напрыканцы насычанага дня гасцей свята чакала яшчэ адна незабыўная сустрэча з беларускім словам і мастацтвам – канцэрт-закрыццё "Льецца песня па-над Шчарай", які сабраў тысячы гледачоў.**

На іх вачах адбылася чарговая значная падзея свята, якая стала яго традыцыяй, – перадача эстафеты Дня пісьменства ад сёлетняй сталіцы да будучай. У 2020 годзе вялікае свята беларускай кнігі, слова, пісьменнікаў і чытачоў прымуць Бялынічы Магілёўскай вобласці.

Перадаючы эстафету, старшыня Слонімскага райвыканкама Генадзь Хоміч перш падзякаваў усім, хто спрычыніўся да свята. Тым, дзякуючы каму яно прайшло на такім высокім узроўні. А Бялынічам жадалі зрабіць Дзень беларускага пісьменства не горшым, а нават лепшым, чым у Слоніме. Бо з кожным годам свята становіцца ўсё больш запамінальным і цікавым.

Канцэрт закрыцця зноў жа падарыў гледачам цёплую сустрэчу з беларускай мовай і нашай багатай культурай. Разам з народнымі гучалі песні на вершы беларускіх аўтараў – класікаў Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, Максіма Танка, Якуба Коласа, Генадзя Бураўкіна, а таксама нашых сучаснікаў Алеся Бадака, Юліі Быкавай, Уладзіміра Мазго і многіх іншых.

# Праекты з літаратурным адценнем

**Крэўскі замак з дапоўненай рэальнасцю, сямейнае чытанне і манеты з выявамі пісьменнікаў: установы і грамадскія аб'яднанні Беларусі прэзентавалі свае праекты з літаратурным адценнем.**

75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў былі прысвечаны праекты Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага саюза жанчын "Беларусь памятае. Жаночы твар Перамогі" і Ленінскай раённай арганізацыі "Жывём. Памятаем. Ганарымся", які ўвасобіўся ў рукатворнай кнізе з малюнкамі дзяцей Гродна, іх бачаннем подзвігу дзядоў і прадзедаў.

*– Актывісткамі жаночага руху вобласці ў межах праекта "Беларусь памятае. Жаночы твар Перамогі" сабраны 75 гісторый жыцця жанчын-ветэранаў, падрыхтавана віртуальная і партрэтная алеі гераінь. А ў 2020 годзе пабачыць свет выданне пра жыццёвыя гісторыі дзяўчын і жанчын вобласці, якія нароўні з мужчынамі кавалі Перамогу на фронце і ў тыле,* – распавяла **старшыня абласной арганізацыі БСЖ Ірына Сцепаненка.**

Цікавым атрымаўся праект "Сямейнае чытанне" абласной арганізацыі БСЖ. Адзін з яго складнікаў – выданне кніг беларускіх і замежных аўтараў, правядзенне мерапрыемстваў па папулярызацыі чытання.

Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне калекцыянераў прадставіла грашовы "скарб" – памятныя манеты, прысвечаныя юбілеям класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы, Якуба Коласа, Адама Міцкевіча, Максіма Танка, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча і іншых. Яшчэ адзін выставачны праект калекцыянераў быў прысвечаны друкаваным выданням Заходняй Беларусі ў 20–30-я гады ХХ стагоддзя.

Крэўскі замак з дапоўненай рэальнасцю прадставіў на Дні пісьменства Нацыянальны гістарычны музей. Убачыць цытадэль, якой яна некалі была, можна было дзякуючы 3D-рэканструкцыі. Таксама гасцям прадставілі праект "Куншты малявання. Адзін дзень з жыцця Сапегаў", які распавядае аб жыцці беларускай шляхты ў XVII стагоддзі праз серыю малюнкаў, выкананых пры дапамозе тэхналогіі стэрэадруку.

Літаратурнаму мінуламу была прысвечана выстава "Слонім і наваколле" Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. У экспазіцыі – насамрэч каштоўныя экспанаты. Да прыкладу, выданне "Іпацьеўскага летапісу", у якім упершыню згадваецца Слонім, выданне друкарні Міхаіла Казіміра Агінскага 1778 года "Кніжка для дзяцей, або Уяўленне пра рэчы, якія дзеці павінны вывучаць", твор аб Жыровіцкім абразе Маці Божай гісторыка Ігната Кульчынскага 1732 года і многія іншыя.

Пазнаёміцца з выбітнай асобай беларускага этнографа, гісторыка Мітрафана Доўнара-Запольскага стала магчыма на мабільнай выставе "Мы ёсць народам!" Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. На ёй прадстаўлены два этапы станаўлення беларускай дзяржаўнасці: 1917–1919 гады і перыяд з 1991-га, калі пачала адлічваць новую гісторыю незалежная Беларусь.

# Яркія фарбы свята

**Паўтара дзясятка тэматычных пляцовак дадалі яркіх фарбаў Дню беларускага пісьменства. І якімі б рознымі і, на першы погляд, далёкімі ад асноўнай тэмы свята яны ні былі, на кожнай знайшла адлюстраванне тэма кнігі і беларускага слова.**

Самы яскравы прыклад – гастрафэст. Мала таго, што з Ваўкавыска прывезлі вялікую кнігу з... сала, дык кожны павільён выбраў стравы з твораў беларускіх класікаў. Так, Гродзенскі мясакамбінат прапанаваў "кілбасы-скруткі, як падковы", а яшчэ кумпякі, грудзінку, шынку... Дарэчы, назвы ўсіх гэтых прысмакаў можна знайсці ў паэме Якуба Коласа "Новая зямля". Парася на ражне зажарыстае, духмянае – гэта дакладна з "Мяча князя Вячкі" Леаніда Дайнекі. Не менш апетытныя вырабы былі ў майстроў гастранамічнай справы з агракамбіната "Скідзельскі". Гэта далікатэсы з паэмы "Тарас на Парнасе". Свая кніга і кулінарны шэдэўр – на кожным падворку.




Турыстычны патэнцыял Слонімшчыны ярка быў прадстаўлены на адпаведнай пляцоўцы. Тут прапаноўвалі адразу 17 бясплатных экскурсій: архітэктура і гісторыя горада над Шчарай, знакамітыя людзі краю, сакральныя Жыровічы і іншыя. Распавядалі гасцям і пра самыя цікавыя маршруты па Гродзеншчыне.

На пляцоўцы духоўнасці можна было пабачыць унікальныя выданні XV-XIX стагоддзяў. Праводзілі майстар-класы па іканапісе ды распавядалі пра асаблівасці гэтай справы. Тут жа можна было пакаштаваць і набыць манастырскія кулінарныя вырабы.

Дзіцячая пляцоўка з прэзентацыяй выдавецтвамі самых цікавых выданняў для дзяцей разгарнулася ў гарадскім парку. Таксама тут прадставілі свае кнігі пісьменніцы Кацярына Хадасевіч-Лісавая і Ліна Багданава. Школы Слонімшчыны падрыхтавалі інсцэніроўкі паводле кніг-юбіляраў гэтага года: "ТВТ" Янкі Маўра, "Дрыгва" Якуба Коласа, "Чорны замак Альшанскі" Уладзіміра Караткевіча, "Альпійская балада" Васіля Быкава і іншых. Тэатры гульні і бібліятэкі вобласці прапаноўвалі дзецям забаўляльна-пазнавальныя праграмы з гульнямі, віктарынамі і падарункамі. Лідчане, да прыкладу, вучылі пісаць "па-даўнейшаму" – сапраўдным пяром.

Цягам усяго дня госці свята нястомна падарожнічалі ад адной пляцоўкі да другой. Пераносіліся ў часе, згадвалі падзеі Вялікай Айчыннай вайны, спявалі ды танчылі з артыстамі вобласці, сваімі рукамі рабілі сувеніры на памяць пра свята, з карціннай галерэі траплялі ў горад майстроў... Свае цікавосткі былі на кожнай пляцоўцы. І ніводная не засталася па-за ўвагай гасцей.

ТЭКСТЫ І ФОТА КАРЭСПАНДЭНТАЎ "ГРОДЗЕНСКАЙ ПРАЎДЫ" І РАЁННЫХ ГАЗЕТ